## АПЫТАННІ ПАКАЗАЛІ

**Паводле exit poll, пераважная большасць выбаршчыкаў аддала свае галасы дзеючаму кіраўніку краіны**

**Маладзёжная лабараторыя сацыялагічных даследаванняў па замове нацыянальнага прадстаўніцтва Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір» у Беларусі правяла нацыянальны exit poll (апытанне на выхадзе з выбарчых участкаў). Апытанне праводзілася на 320 участках па ўсёй краіне. Інтэрв'юеры прапаноўвалі тым, хто прагаласаваў, прайсці ананімнае апытанне. На пытанне аб тым, за каго рэспандэнт аддаў свой голас, адказалі 67,6 %, адмовіліся адказваць 32,4 %. Усяго было апытана 12 340 чалавек. Выбарка — шматступенная, камбінаваная.**

Паводле exit poll Маладзёжнай лабараторыі, кандыдаты прадэманстравалі наступныя вынікі: Аляксандр Лукашэнка набраў — 79,7 %, Святлана Ціханоўская — 6,8 %, Ганна Канапацкая — 2,3 %, Андрэй Дзмітрыеў — 1,1 %, Сяргей Чэрачань — 0,9 %. Супраць усіх, паводле exit poll, прагаласавалі — 9,2 % выбаршчыкаў.

Апытанне рабіў таксама Аналітычны цэнтр Ecoom. Даследаванне праводзілася ў асноўны дзень выбараў па тэлефоне. Рэспубліканская выбарка склала 2817 рэспандэнтаў, статыстычная хібнасць не перавышае 2,5-4 %. Электаральныя перавагі грамадзян размеркаваліся наступным чынам: Аляксандр Лукашэнка — 78,9 %, Святлана Ціханоўская — 7,1 %, Ганна Канапацкая — 2,1 %, Андрэй Дзмітрыеў — 0,9 %, Сяргей Чэрачань — 0,8 %, супраць усіх — 10,2 %. Аналіз вынікаў праведзенага аналітычным цэнтрам Ecoom па замове ЗАТ «Другі нацыянальны канал» сацыялагічнага апытання сведчыць пра высокі інтарэс насельніцтва да выбарчай кампаніі.

Па замове канала СТБ праводзілася яшчэ адно апытанне. Спецыялісты цэнтра сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДУ апытвалі выбаршчыкаў на 160 участках Мінска і Мінскай вобласці. Расказаць пра свае электаральныя перавагі пагадзіліся прыкладна дзве траціны рэспандэнтаў. Аляксандр Лукашэнка, паводле апытання, набраў 71,4 %, Святлана Ціханоўская — 10,1 %, Ганна Канапацкая — 2,4 %, Андрэй Дзмітрыеў — 1,6 %, Сяргей Чэрачань — 1,4 %. Супраць усіх, па выніках exit poll, прагаласавалі 13,1 % выбаршчыкаў.

**Паводле БелТА.**

Выбары. Погляд прафесіяналаў

# У дзень выбараў меркаваннямі і прагнозамі з журналістамі падзяліліся эксперты

### Аляксандр ШПАКОЎСКІ: КАНСТЫТУЦЫЙНЫ ЛАД ВЫСТАІЦЬ



На думку палітолага, сёлетняя выбарчая кампанія была дастаткова складаная — у першую чаргу праз выкарыстанне канкурэнтамі дзеючай улады палітычных тэхналогій, з якімі Беларусь раней не сутыкалася.

«Адразу ж сутыкнуліся з вельмі агрэсіўнымі паводзінамі апанентаў: выкарыстоўвалася тэхналогія кібербулінгу (калі людзі, якія адкрыта выражаюць праберарускую, прадзяржаўную пазіцыю ў сацыяльных сетках, у коле сваіх зносін пачыналі сутыкацца з пагрозамі, ціскам, абразамі). Усё гэта было накіравана на тое, каб зачысціць інфармацыйную прастору і каб там патрыятычнага пункту гледжання не засталося ў прынцыпе», — растлумачыў эксперт.

Яшчэ адзін новы момант — сацыяльныя сеткі. Па словах палітолага, ужо ў 2017 годзе было відаць з'яўленне цэлай сеткі рэсурсаў, палітычных блогаў. Падыход у іх неаматарскі, працуе высокапрафесійная каманда з добрым фінансаваннем. У выніку YouTube- і тэлеграм-каналы сталі асноўнымі крыніцамі распаўсюджвання дэструктыўнай інфармацыі.

Акрамя таго, першапачаткова шэраг кандыдатаў звярнуўся да тактыкі стварэння ілюзіі большасці, калі прыхільнікам укідваецца ідэя аб тым, што іх абсалютная большасць, у Прэзідэнта рэйтынг надзвычай нізкі, а выбары яны ўжо выйгралі (калі яшчэ рэгістрацыя не скончылася).

«Асобныя рэсурсы заявілі, што кампанія зроблена, «нас 97 працэнтаў», застаецца толькі адстаяць перамогу — на вуліцы. Потым уладзе ўдалося ўзяць сітуацыю пад кантроль, галоўнай крыніцай і галоўным пастаўшчыком навін стаў дзеючы Прэзідэнт», — нагадаў Аляксандр Шпакоўскі.

Шэраг дзеянняў Аляксандра Лукашэнкі кшталту правядзення парада 9 Мая, Паслання, інтэрв'ю ўкраінскаму журналісту не застаўся незаўважаным і дазволіў пераламіць сітуацыю на карысць дзеючай улады.

«Таму мой прагноз, што канстытуцыйны лад Беларусі выстаіць, Прэзідэнт пераможа ў першым туры. Акцыі пратэсту і выхад нязгодных на вуліцы будуць, але ў дзяржавы дастаткова сіл і сродкаў, каб забяспечыць бяспеку, правапарадак. І я вельмі спадзяюся, што ўдасца і пазбегнуць надзвычайнага ціску на тых, хто пратэстуе, і ўтрымаць людзей у рамках прававога поля. Таму што права на пратэст ёсць — іншае пытанне, што яны не маюць права парушаць закон», — падкрэсліў палітолаг.

### Аляксей ДЗЕРМАНТ: СУР'ЁЗНЫХ АБВАСТРЭННЯЎ НА ЗАХОДНІМ КІРУНКУ НЕ БУДЗЕ



Навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі ўпэўнены: з унутранай абстаноўкай у краіне ўлада і праваахоўнікі справяцца. Цікавыя сюжэты могуць разгарнуцца пасля выбараў у міжнародным сэнсе, перш за ўсё ў адносінах з Расіяй.

«Камунікацыя двух прэзідэнтаў апошнім часам многія пытанні і напружанні здымае. Пуцін заявіў пра тое, што не варта разгойдваць лодку, бо мы ўсе ў ёй сядзім і, адпаведна, мы ў адной камандзе. З гэтага я раблю вывад, што насамрэч сляды, якія, магчыма, цягнуліся да часткі палітыкафарміруючых колаў у Расіі, — гэта не пазіцыя Крамля, а асобныя прыватныя інтарэсы. І непасрэдна кантакт нашых прэзідэнтаў гэта толькі пацвярджае», — разважае Аляксей Дзермант.

На думку навукоўца, сілы, зацікаўленыя ў разгойдванні сітуацыі ў краіне, іграюць у выніку і супраць інтарэсаў Расіі. Таму вучоны ўпэўнены, што яны атрымаюць па заслугах у абедзвюх краінах. Адносіны ж Беларусі і Расіі востры перыяд перажывуць, і далей дзяржавы будуць займацца інтэграцыйным працэсам.

«Заходняя рэакцыя ў дадзеным выпадку другасная. Нейкага вострага інтарэсу, ажыятажу ў заходніх палітыкаў нашы выбары не выклікаюць, таму, думаю, адбудзецца прадказальнае прызнанне дэ-факта выніку выбараў і працягнецца звычайная камунікацыя паміж дзяржавамі», — прадказвае Аляксей Дзермант.

На яго думку, захад і Еўрасаюз у прыватнасці не зацікаўлены ў абвастрэнні адносін з намі і не збіраюцца даваць нейкія рэзкія ацэнкі. З заяў будучага пасла ЗША эксперт пры ўсіх звычайных заўвагах таксама не пачуў рэзкіх ацэнак.

«Выбары — гэта перш за ўсё беларуская ўнутраная справа. Вядома, ацэнкі партнёраў важныя, але легітымнасць улады трымаецца менавіта на выніках волевыяўлення беларускага народа. А калі мы будзем упэўнены ў сваёй унутранай легітымнасці, то знешнія пляцоўкі раней ці пазней прызнаюць выбар, які зрабіў беларускі народ», — адзначыў эксперт.

### Вадзім ГІГІН: ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА — САМАЯ ВАЖНАЯ ПАДЗЕЯ ГОДА



Палітолаг адзначае вельмі высокую актыўнасць выбаршчыкаў, у тым ліку на датэрміновым галасаванні. Яе Вадзім Гігін тлумачыць летнім перыядам, калі многія праводзяць выхадныя за горадам. А гэта яшчэ і час адпачынкаў.

Эксперт нагадаў вынікі даследавання Маладзёжнай лабараторыі пры Беларускім камітэце маладзёжных арганізацый: каля 90 працэнтаў лічаць выбары Прэзідэнта самай важнай падзеяй года — важнай асабіста для сябе.

«Жорсткая канкурэнцыя паміж штабамі ці групамі, якія сталі за некаторымі кандыдатамі. Працаўнікі Аляксандра Лукашэнкі спрабавалі максімальна мабілізаваць пратэсны электарат, ён заўсёды ёсць. У апошнія тыдні актывізаваўся электарат дзеючага Прэзідэнта», — адзначыў палітолаг.

Па яго словах, гэтая кампанія вылучалася вялікай колькасцю фэйкавых сацыялагічных укідаў. Нацыянальны экзітпол дасць поўную афіцыйную інфармацыю.

«Прынцыпова важна, каб увесь выбарчы працэс праходзіў менавіта ў канстытуцыйных рамках. Гэта важна для кожнага грамадзяніна, для выбаршчыка, для кандыдатаў. Гэта безумоўна важна і для месца і іміджу Беларусі на міжнароднай арэне, і хацелася б, каб гэтыя выбары прайшлі ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, мы спакойна аддалі свой голас, спакойна дачакаліся вынікаў і потым, як гэта і бывае, пракаментавалі, абмяняліся меркаваннямі», — падкрэсліў Вадзім Гігін.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Бяспека: афіцыйна

# ГІСТОРЫЯ АДНОЙ НОЧЫ

**У ноч на панядзелак па краіне былі адзначаны зборы людзей каля выбарчых участкаў і на цэнтральных плошчах 33 населеных пунктаў. Падрабязней пра падзеі, якія адбыліся на вуліцах гарадоў пасля закрыцця выбарчых участкаў, расказала прэс-сакратар МУС Вольга ЧАМАДАНАВА.**




Фота БелТА.

— Усяго па краіне за ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах было затрымана каля 3 тысяч чалавек. З іх тысяча — у Мінску і больш за дзве — у іншых рэгіёнах краіны. У выніку сутычак пацярпела больш за 50 грамадзян, а таксама 39 супрацоўнікаў міліцыі. Некаторыя з іх былі шпіталізаваныя.

У ведамстве дадалі, што ў Мінску прыкладна а 22-й гадзіне ў раёне стэлы «Мінск — горад-герой» пратэстоўцы запальвалі фаеры, раскідвалі на праезную частку шыпы, цвікі, узводзілі барыкады з мабільных турнікетаў, разбіралі тратуарную плітку і кідаліся ёй і іншымі прадметамі ў супрацоўнікаў міліцыі.

— Актыўнае супрацьстаянне праваахоўнікам было аказана ў Пінску. Там на супрацоўнікаў міліцыі паспрабавала напасці група агрэсіўна настроеных людзей. Яны выкарыстоўвалі завостраныя калы, пруты, камяні і арматуру, — заявіла Вольга Чамаданава.

Яна звярнула ўвагу на тое, што частка людзей, якіх даставілі ў бальніцы, была ў стане алкагольнага ап'янення, і адзначыла, што баявая зброя не выкарыстоўвалася. Загінулых няма.

Старшыня Следчага камітэта Іван Наскевіч адзначыў, што па фактах масавых беспарадкаў і гвалту ў дачыненні да супрацоўнікаў міліцыі заведзены крымінальныя справы.

— Былі адабраны запісы камер відэаназірання. Асобы, датычныя да беспарадкаў, або ўжо высветлены, або высвятляюцца. Дзеянням іх усіх абавязкова будзе дадзена прававая ацэнка, заведзены крымінальныя справы па розных частках артыкула 293 Крымінальнага кодэкса. Адказнасць за гэтыя дзеянні адпаведна — да 8 і 15 гадоў пазбаўлення волі.

Іван Наскевіч заклікаў не паддавацца на правакацыі і заклікі да парушэння грамадскага парадку.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

### • Дарэчы

Медыцынская дапамога спатрэбілася як праваахоўнікам, так і ўдзельнікам незаконных акцый. «На гэты момант на лячэнні знаходзіцца каля 40 супрацоўнікаў МУС і больш як 50 удзельнікаў вулічных акцый, — паведаміў учора пасля абеду **міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК.** — Стан усіх ацэньваецца як стабільны».

«На шчасце, абышлося без ахвяр», — падкрэсліў міністр, абвяргнуўшы інфармацыю аб тым, што пад коламі спецаўтамабіля загінуў мужчына. Высветлілася, што 35-гадовы мінчанін, раней судзімы за хуліганства, спрабаваў заскочыць на аўтамабіль МУС, які рухаўся, і сарваўся. Яго даставілі ў бальніцу хуткай дапамогі, дзе дыягнаставалі чэрапна-мазгавую траўму лёгкай ступені, страсенне мозга, удар ніжняй губы, алкагольнае ап'яненне (аналіз паказаў у крыві 2,3 праміле алкаголю).